© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Апошні ўкраінскі палітвязень выйшаў з беларускай турмы (стар. 2)
Не забудзься заплаціць за сваё аўто (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Намеснік галоўнага рэдактара
Усевалад Рагойша
Заснавальнік Павел Жук
Наклад 34.200
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Серада, 30 ліпеня 1997 г. № 82 Кошт свабодны

Украіна накіравала Лукашэнку ноту пратэсту

Нота наконт крытычных выказванняў Аляксандра Лукашэнкі на адрас Украіны перададзеная дарадцу пасольства Рэспублікі Беларусь у Кіеве.

Нагадаем: знаходзячыся 22 ліпеня на Мінскім авіярамонтным заводзе, А.Лукашэнка заявіў, што з Украінай *«вельмі цяжка працаваць»*, што *«Украіна можа быць незалежнай, але не за наш кошт»* і да таго падобнае. Ён таксама паведаміў аб намеры ўвесці ў дачыненні да Украіны *«жорсткія меры мытнага і пагранічнага кантролю»*.

У ноце ўкраінскага боку адзначаецца, што выказванні А.Лукашэнкі *«не адпавядаюць духу адносінаў дзвюх дзяржаваў і выклікаюць здзіўленне»*. МЗС Украіны адзначае, што адносіны Украіны і Беларусі характарызуюцца *«адсутнасцю ўзаемных прэтэнзій палітычнага, тэрытарыяльнага ці іншага характару»*. Знешнепалітычнае ведамства Украіны звяртае таксама ўвагу на тое, што ў міжнародных арганізацыях Украіна на працягу апошніх гадоў *«актыўна праводзіць лінію на падтрымку Беларусі і недапушчэнне яе ізаляцыі ў сусветнай і асабліва еўрапейскай садружнасці»*.

БелаПАН — УНІАН

Напад на каравул

У адной з воінскіх часцей Гомельскай вобласці здарыўся беспрэцэдэнтны выпадак. Невядомыя ўчынілі напад на каравул і захапілі два аўтаматы АК-74 і 60 патронаў.

У ноч з нядзелі на панядзелак двое злачынцаў спачатку аглушылі аднаго вартавога і, завалодаўшы ягоным аўтаматам, вымусілі другога пад прыцэлам аддаць зброю. Гэтыя вартавыя знаходзіліся на розных пастах, паведамілі ў прэс-службе міністэрства абароны.

Калі нумар здаваўся ў друк, месца знаходжання злачынцаў заставалася невядомым. *«Больш звестак па факце прэс-служба МА не мае»*, — запэўніў падпалкоўнік Міхаіл Сцепановіч. На месцы здарэння працуе спецыяльная камісія, якая, на думку М.Сцепановіча, да канца тыдня высветліць падрабязнасці.

Гэты інцыдэнт (і шэраг іншых, што мелі месца раней) вымушае міністэрства абароны прыняць дзейсныя меры, каб умацаваць пасты, зберагчы зброю і жыцці людзей, падкрэсліў падпалкоўнік Сцепановіч.

Аляксандр ШКУЦЬКО

Бел-чырвона-белы сцяг высокай напругі

Няўлоўны Мірон нічога не баіцца: у ноч з 25 па 26 ліпеня ён вывесіў бел-чырвона-белы сцяг на 40-метровай мачце электралініі напругай у 110 тысяч вольт.

СВАБОДА ўжо не раз пісала пра Мірона, які неаднойчы прымацоўваў нацыянальныя сцягі на самых высокіх кропках Лёзна і Віцебска. Разам са сцягам Мірон заўсёды пакідаў запіску, у якой паведамляў, дзеля чаго ён праводзіць свае акцыі. На гэты раз сцяг правісеў на мачце ЛЭП да 15 гадзін 26 ліпеня і быў зняты спецыяльна выкліканай з Віцебска брыгадай электрыкаў-высотнікаў. У прымацаванай запісцы паведамлялася, што Мірон вывесіў сцяг *«ад імя ўсіх сапраўдных мужыкоў Віцебшчыны»*.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Акадэмія мастацтваў без рэктара?

Пра адстаўку Васіля Шаранговіча з пасады рэктара Беларускай акадэміі мастацтваў у акадэміі і ў міністэрстве культуры даведаліся з газет.

Учора ў «Советской Белоруссии» з'явілася публікацыя, што прэзідэнт сваім рашэннем *«за парушэнні пры арганізацыі ўступных экзаменаў»* вызваліў ад пасады рэктара Беларускай акадэміі мастацтваў Васіля Шаранговіча, а намесніку міністра культуры У.Рылатку аб'яўленая строгая вымова.

Аднак прарэктар акадэміі Леанід Дзягілеў катэгарычна не згодны з большасцю высноваў, якія зрабіў па выніках праверкі старшыня камітэта дзяржаўнага кантролю М.Дамашкевіч. Л.Дзягілеў сцвярджае, што па фактах так званых парушэнняў пры абмеркаванні з кантралёрамі *«незакрытых пытанняў не засталося. Мы поўнасцю згодныя толькі з тым, што былі хібы ў запаўненні бланкаў, але гэта ні ў якай ступені не паўплывала на аб'ектыўнасць выстаўлення адзнак на ўступных экзаменах»*, — падкрэсліў прарэктар.

У міністэрства культуры крыху іншая думка. Загадчык упраўлення навучальных установаў А.Сцепанцоў, які якраз рыхтуе афіцыйнае тлумачэнне, падрабязныя каментарыі даваць адмовіўся, але ў той жа час заўважыў, што *«падчас экзаменаў былі недагляды»*. Ён нагадаў, што папярэдні рэктар акадэміі быў вызвалены з пасады за аналагічныя парушэнні.

Васіль Шаранговіч цяпер знаходзіцца ў чарговым адпачынку. У акадэміі лічаць, што публікацыю ў «СБ» нельга разглядаць як афіцыйны дакумент, таму што яна не суправаджаецца адпаведнымі атрыбутамі (няма ні нумара, ні даты).

Аляксандр ШКУЦЬКО

ПЕРАМОВЫ

Рэжым кампрамісаў не прымае

Яшчэ пад канец другога раўнда перамоваў паміж рэжымам і Вярхоўным Саветам кіраўнік дэлегацыі Еўрасаюза, што пасрэднічае на перамовах, ірландскі юрыст М.Расэл сказаў прадстаўнікам Лукашэнкі: *«Нашую цярплівасць і жаданне ва ўсім разабрацца не трэба лічыць за магчымасць пусціць нам пыл у вочы»*. Як паказаў трэці раўнд, які пачаўся ўчора, парада засталася дарэмнай.

Нагадаем, што пасля першага раўнда перамовы зайшлі ў тупік па адным працэдурным пытанні, а менавіта на першым пункце рэгламента: прадстаўнікі рэжыму адмовіліся абмяркоўваць тую самую Канстытуцыю 1994 г., якую самі ж з пачатку прапанавалі ў якасці прадмета перамоваў. Другі раўнд прайшоў абсалютна ўпустую, трэці, падобна, чакае такіж лёс.

Дэлегацыя ад прэзідэнта, якая ўчора складалася толькі з міністра замежных справаў І.Антановіча і ягонай намесніцы Н.Мазай, парушыўшы ўсякі этыкет, спазнілася на 15 хвілін. Перамовы пачаліся з таго, что І.Антановіч пажадаў пагутарыць з М.Расэлам сам-насам. Гэткая магчымасць яму была дадзеная, але наш міністр скарыстаў з яе для таго, каб выкласці ўсё тыя ж непрымальныя пазіцыі: прадстаўнікі рэжыму хочуць зрабіць мэтаю перамоваў лукашэнкаўскую канстытуцыю, якую Еўропа не прызнае.

Гэты факт (г.зн. што ніякіх зрухаў няма) еўрапейцы данеслі да прадстаўнікоў Вярхоўнага Савета. І надалей пасрэдніцкая місія Еўрасаюза зрэалізоўвалася занадта літаральна: дэлегацыі рэжыму і ВС зносіліся паміж сабою толькі праз гасцей.

Дэлегацыя Еўрасаюза прапанавала першы пункт рэгламента з папраўкаю: не ўсе ўдзельнікі перамоваў прызнаюць Канстытуцыю 1994 г., але, каб перамовы маглі рухацца далей, прымаюць яе за прадмет абмеркавання. Прадстаўнікі ВС падпісаліся пад тым, што згодныя прыняць рэгламент з гэтай заўвагаю.

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

За свой «другі дом» ліцэісты гатовыя стаяць і сядзець да канца

Пакуль без відавочных вынікаў ідзе барацьба бацькоўскага камітэта і вучняў Беларускага гуманітарнага ліцэя за будынак на вуліцы Кірава, 21. Абаронцы ліцэя працягваюць штодзённыя пікетаванні на Кастрычніцкай плошчы і вуліцы Карла Маркса, збіраюць подпісы ў сваю падтрымку (ужо сабрана больш за 4 тысячы подпісаў), рассылаюць па ўсіх магчымых адрасах звароты і вядуць няпросты дыялог з прадстаўнікамі ўлады, якія па-ранейшаму раздаюць абяцанкі «разабрацца».

Напрыклад, дагэтуль нічога канкрэтнага не паведамляюць удзельнікам акцый пратэсту высокія чыноўнікі з міністэрства адукацыі і адміністрацыі прэзідэнта. Мікалай Фяськоў, кіраўнік упраўлення агульнай і сярэдняй адукацыі міністэрства адукацыі, які прыйшоў у мінулы панядзелак на бацькоўскі сход у ліцэй замест міністра Васіля Стражава, абмежаваўся завярэннямі, што, па-першае, гаворка не ідзе аб ліквідацыі ліцэя як навучальнай установы, а па-другое — міністэрства *«напружана шукае варыянт адсялення, які задаволіць ліцэістаў і іхніх бацькоў»*. На пытанне, навошта ўвогуле спатрэбілася выкідваць ліцэй з будынка, які цалкам адпавядае мэтам навучання, спадар Фяськоў нічога бацькам адказаць не змог.

Ліцэісты штодзень выстаўляюць пікеты на Кастрычніцкай плошчы сталіцы. За свае правы яны гатовыя стаяць і сядзець да канца.

А пакуль маці ліцэістаў накіравалі лісты жонцы амерыканскага прэзідэнта Хілары Клінтан і жонцы кіраўніка беларускай дзяржавы Галіне Лукашэнка. *«Мы вымушаныя змагацца з афіцыйнай уладай, якая мае намер пазбавіць нашых дзяцей права атрымаць адукацыю ў навучальнай установе, якую яны і мы, іх маці, абралі»*, — пішуць беларускія жанчыны ў лісце ў Белы Дом. Яны спадзяюцца, што Хілары Клінтан *«прыхільна паставіцца»* да гэтай просьбы і *«выкарыстае свой вялікі аўтарытэт дзеля падтрымкі справядлівага змагання за канстытуцыйныя правы ў Беларусь»*. Па звестках, амерыканскія дыпламаты са спагадай паставіліся да праблемаў ліцэістаў і пабяцалі зрабіць захады, каб гэты ліст як найхутчэй трапіў на стол да спадарыні Клінтан.

Што тычыцца ліста да Галіны Радзівонаўны Лукашэнка, то яно ўжо павінна было прыйсці ў вёску Рыжкавічы, дзе знаходзіцца сямейнае гняздо беларускага прэзідэнта. *«Шаноўная Галіна Радзівонаўна!* — пішуць маці ліцэістаў жонцы прэзідэнта. — *Нам даводзілася чуць, нібыта будынак у нас забіраюць якраз таму, што Беларускі гуманітарны ліцэй — адзіная сёння навучальная ўстанова ў сталіцы, дзе выкладанне ўсіх прадметаў вядзецца па-беларуску. Мы не хочам верыць у гэта»*. Аўтары ліста запрасілі Галіну Лукашэнка наведаць ліцэй 1 верасня, каб самой пераканацца, што *«дзеці нездарма лічаць яго сваім другім домам»*.

Адказваць на гэты ліст ці не — асабістая справа Галіны Радзівонаўны Лукашэнка. Між тым Аляксандр Лукашэнка — службовая асоба і абавязаны адрэагаваць на зварот ліцэістаў і іхніх бацькоў. Аднак ніякага адказу ад прэзідэнта яны пакуль не атрымалі.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Падрыхтоўка да бітвы

Заўтра, у чацвер, збярэцца штаб па арганізацыі чарговай бітвы за ўраджай з удзелам прэзідэнта Лукашэнкі. Як заўсёды, калгасы будуць імкнуцца выбіць з бюджэту грошы на паліва.

Хутчэй за ўсё гэта ім не ўдасца, бо грошай у «цэнтра» мала. У міністэрстве сельскай гаспадаркі падлічылі, што на ўсіх калгасна-саўгасных рахунках цяпер налічваецца прыкладна трыльён рублёў. На гэтыя сродкі і давядзецца купляць паліва. Пры гэтым нікога не хвалюе, што ў многіх гаспадарках не ліквідаваная запазычанасць па зарплаце за красавік-травень, якая складае па краіне 120 мільярдаў рублёў. Цяпер гаспадаркі пастаўленыя перад дылемай: альбо плаціць калгаснікам цяжкай працай заробленую плату — альбо купляць паліва для бітвы. Тым гаспадаркам, якія не маюць грошай, галоўнакамандуючы, магчыма, скажа на паседжанні штаба, дзе іх узяць.

А вось фермеры працуюць на сваёй зямлі, не трацячы грошай на пустыя селектарныя нарады. Што пасеялі — тое і сабралі. Ураджайнасць у мінулым годзе склала ў іх 20,3 цэнтнера з гектара. Будзе хлеб і сёлета. Некаторыя гаспадары будуюць свае свінафермы і кароўнікі.

Працаваць можна, — абы не перашкаджалі. Як сведчыць статыстыка, на 1 ліпеня ў Беларусі налічваецца 2.786 фермерскіх гаспадарак, якія займаюць 62,3 тысячы гектараў. Гэта на 259 гаспадарак менш, чым у мінулым годзе. З года ў год практычна не павялічваецца сярэдні памер зямельнага ўчастка фермераў, які складае цяпер 22,4 гектара. У параўнанні з мінулым годам у фермераў паменшылася колькасць трактараў і нават коней.

Тым не менш фермеры працягваюць прадаваць сваю прадукцыю. На 1 ліпеня яны прадалі дзяржаве 35 тон мяса (жывой вагой) і 143 тоны малака. Улады шукаюць магчымасць выціснуць з фермераў як мага больш грошай. Пасля перарэгістрацыі, якой займалася вертыкаль, фермераў чакаюць новыя турботы ў сувязі з новым зямельным кодэксам. Слова «фермер» збіраюцца наогул замяніць «прыватным прадпрымальнікам». У саюзе фермераў ацэньваюць гэта як *«чарговы маральна-палітычны ўдар»* па гаспадарах сваёй зямлі, які кінулі выклік прагнілай калгаснай сістэме.

Мікола ВАЙТОВІЧ



Беларускія фермеры гадуюць каля 7 тысяч свіней. У большасці гаспадарак жывёла ўтрымліваецца ў даволі прымітыўных умовах, традыцыйных драўляных хлявах. Аднак пры гэтым эфектыўнасць фермерскай свінагадоўлі не меншая, чым на калгасных комплексах.

Чарка без скваркі

Дзяржаўным прадпрыемствам, якія займаюцца перапрацоўкай мяса, катастрафічна не хапае сыравіны.

Крызіс закрануў і Мінскі мясаперапрацоўчы завод. Прадпрыемства вымушанае часткова спыняць вытворчасць, каб набраць мяса хаця б на некалькі наступных дзён працы. Запасы ў заводскіх рэфрыжэратарах вельмі слабыя.

Рэч у тым, што набываць сыравіну ў калгасаў становіцца ўсё цяжэй: тыя, нягледзячы на дзяржаўнае «пільнае вока», аддаюць перавагу прыватным фірмам, якія займаюцца экспартам мяса ў Расію. Значная частка беларускага мяса выкарыстоўваецца як сродак бартэрнага разліку беларускіх прадпрыемстваў з расійскімі фірмамі. Да таго ж перапрацоўшчыкі не могуць павісіць свае цэны для беларускага гандлю, а сыравіну ў калгасаў тымчасам вымушаныя купляць па цэнах, якія пастаянна растуць.

Беларускія каровы і свінні кормяць братоў па Мытным саюзе, а айчынны спажывец адчувае вынік на ўласным страўніку. Знайсці танную вараную каўбасу ў крамах бывае няпроста, а Мінскі мясаперапрацоўчы завод ад выпуску танных гатункаў мае адны страты — ажно да 25 тысяч рублёў з кілаграма. Каб павысіць рэнтабельнасць, заводу трэба павялічыць выпуск, а гэта немагчыма з прычыны цяжкага фінансавага становішча і недахопу сыравіны. І пакуль перапрацоўшчыкі сядзяць на «галодным пайку», спажыўцам таксама давядзецца падцягнуць паясы.

Максім БУРАЧЭЎСКІ

«Самае надзейнае – вадзіцельскае крэсла»

Калі калгасам не ўдасца адрапартаваць пра дадатковыя 25% нарыхтаваных кармоў, ахвярнымі казламі могуць зрабіць гараджан.

Прыкладам, на нарадзе ў віцэ-прэм'ера У.Гаркуна востра крытыкавалі прадукцыю ВА «Гомсельмаш». Цяпер на «Гомсельмашы» сур'ёзна занепакоеныя, што невыкананне прэзідэнцкага распараджэння будзе спісанае на дрэнную якасць гомельскіх кормаўборачных камбайнаў, у якіх *«самое надежное — водительское кресло, и то только потому, что основную часть времени механизатору приходится проводить не за рулем, а за ремонтными работами»*. Гэта радкі з ліста міністру *«простага механізатара»* з Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці Міхаіла Тарасевіча, якое і было зачытанае на нарадзе.

У Гомелі добра разумеюць, што выпадковых лістоў на вышэйшым узроўні не чытаюць, і вырашылі «паўплываць» на самога механізатара Міхаіла. Яго запросяць у Гомель, каб на месцы паказаць, як робяцца тыя камбайны. А сэрца простага працаўніка памякчэе і ён напіша іншы ліст?

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Грамадскія работы – для ўсіх ахвотных

Актыўна выконвае прэзідэнцкі ўказ аб грамадскіх работах Гомельскі абласны цэнтр занятасці.

Распрацаваная ў цэнтры праграма прадугледжвае прыцягненне да грамадскіх работ сёлета 12 тысяч чалавек, у тым ліку 9.500 — беспрацоўных. За паўгода на грамадскія работы ўжо накіраваныя 8.190 чалавек, з іх 6.311 беспрацоўныя.

Увогуле ж колькасць ахопленых «прэзідэнцкай ласкай» грамадзян сёлета павялічылася ў 2,3 раза ў параўнанні з мінулым годам. Акрамя беспрацоўных, на грамадскіх работах ужо адпрацавалі 501 пенсіянер, 175 навучэнцаў і студэнтаў і 724 «працоўныя», якія не маюць чаго рабіць на сваіх «запушчаных» прадпрыемствах.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Універмагі плятуць сетку

Шэраг буйнейшых універмагаў Беларусі вырашылі стварыць асацыяцыю. Мяркуючы па заявах удзельнікаў, асацыяцыя можа стаць першым крокам да аб'яднання крамаў-гігантаў у адну гандлёвую сетку.

Сярод універмагаў-удзельнікаў асацыяцыі — мінскі ГУМ, гродзенскі Гандлёвы дом «Нёман», магілёўскі «Цэнтральны», універмаг «Гомель» і дзяржаўнае прадпрыемства «Брэсцкі цэнтральны універмаг». Ініцыятары запрашаюць далучыцца ўсіх ахвотных, каб працаваць *«пад эгідай высокай якасці, перадавых тэхналогій, адзінага таварнага знака»*.

Апошні пункт падаецца асабліва цікавым. Адзіны таварны знак па ідэі прадугледжвае аналагічную арганізацыю гандлю і — адзіную цэнавую палітыку. Гэта азначае, што цэны на тыя ж самыя тавары ў розных універмагах асацыяцыі павінны быць аднолькавымі (ці, прынамсі, блізкімі).

Удзельнікі асацыяцыя таксама спадзяюцца, што разам ім будзе прасцей супрацьстаяць дыктату вытворцаў-манапалістаў, уплываць на кан'юнктуру вытворчасці. Сумеснымі плануюцца і рэкламныя кампаніі, сезонныя распродажы тавараў і г.д. Пры гэтым члены асацыяцыі захаваюць сваю юрыдычную і эканамічную самастойнасць.

Ян ГАЛЕВІЧ

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя «Народная грамада», Беларуская сацыял-дэмакратычная моладзь «Маладая грамада» глыбока смуткуюць з прычыны смерці **Лявона Луцкевіча**, сына аднаго з заснавальнікаў Беларускай сацыял-дэмакратыі і Беларускай Народнай Рэспублікі Антона Луцкевіча.

Беспрацоўныя пра сваё беспрацоўе

Амаль 51 % апытаных магілёўскіх беспрацоўных згадзіліся б заняцца прыватным бізнесам.

Пра гэта сведчыць сацыялагічнае апытанне, праведзенае Магілёўскім цэнтрам занятасці. Адказвалі на пытанні сацыёлагаў каля 150 чалавек, зарэгістраваных як беспрацоўныя. У працаўладкаванні 53% разлічваюць на сабе, сваіх сяброў і сваякоў. На дзяржаву ўскладаюць спадзяванні толькі 19%. 80% апытаных лічаць, што беспрацоўных цяпер надзвычай многа.

Дзве трэці апытаных ахвяр беспрацоўя галоўнымі яе наступствамі назвалі матэрыяльныя цяжкасці, чвэрць рэспандэнтаў найперш шкадуюць аб зніжэнні сваёй кваліфікацыі, 16% — аб пагаршэнні свайго сацыяльнага статуса, 12% указваюць на ўзмацненне пачуцця адзіноты.

71% удзельнікаў апытання пазначылі галоўнай прычынай таго, што яны дагэтуль не знайшлі працы, адсутнасць адлаведных іхнім патрабаванням прапановаў, 41% рэспандэнтаў згодныя займацца менш кваліфікаванай працай. Толькі 37% прапанавалі хоць нейкае рашэнне праблемы беспрацоўя, астатнія ўскладаюць надзеі на дзяржаву, Канстытуцыю і змену грамадска-палітычнага ладу.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Падаткі множацца

Гомельскі аблвыканкам прыняў рашэнне стварыць абласны мэтавы фонд фінансавання жыллёвага будаўніцтва, крэдытавання і субсідавання грамадзян.

З гэтай мэтай у Галоўным упраўленні Нацыянальнага банка будзе адкрыты спецрахунак. Мэтавыя падаткі будуць плаціць усе юрыдычныя асобы, а таксама замежныя грамадзяне, якія маюць асабісты разліковы рахунак і займаюцца гаспадарчай дзейнасцю. Мэтавы збор будзе вылічацца з прыбытку, што застаецца ў распараджэнні прадпрыемства пасля аплаты асноўных падаткаў і складзе 0,1% ад сумы, што падлягае падаткаабкладанню. А гэта значыць, што і без таго тонкія кішэні нашых прадпрыемстваў яшчэ збяднеюць. А вось ці пойдуць гэтыя грошы на жыллёвую дапамогу простым людзям — невядома, бо яснай праграмы выкарыстання сродкаў Гомельскі аблвыканкам пакуль не прадставіў.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Подпісы супраць вынасу цела

Беларускіх камуністаў з КПБ моцна непакоіць лёс цела «вечна жывога» правадыра.

На мінскіх прадпрыемствах ужо распачаўся збор подпісаў супраць вынасу цела Леніна з маўзалея. Начальнікі-камуністы прапануюць падначаленым-некамуністам паставіць свае подпісы. Але апошнія слушна заўважаюць, што яны — грамадзяне іншай краіны, дык няхай расіяне самі вырашаюць, што ім рабіць з гэтым целам, таму подпісы не ставяць.

Вера КРУПСКАЯ

Чытайце газету **СВАБОDА** ў *Internet*
http:\\www.gis.minsk.by
Адрас *E-mail* для даведак: edit@svaboda.minsk.by

Апошні ўкраінскі палітвязень выйшаў з беларускай турмы

На мінулым тыдні з магілёўскай калоніі УЖ 15/19 быў вызвалены 30-гадовы грамадзянін Украіны Андрэй Шаптыцкі, які быў асуджаны ў верасні мінулага года на 2 гады і 3 месяцы пазбаўлення волі за актыўны ўдзел у «Чарнобыльскім шляху-96». Пазней у выніку амністыі тэрмін яму быў скарочаны на 1 год. Як вядома, астатнія 5 украінцаў, асуджаных разам з Андрэем, выйшлі на свабоду раней. Я сустрэўся са сп.Шаптыцкім на святкаванні Дня незалежнасці 27 ліпеня ў Мінску і ён згадзіўся адказаць на пытанні СВАБОДЫ.

— Андрэй, ты больш года правёў у беларускіх турмах. Якія ўражанні засталіся ў цябе ад знаходжання ў зняволенні?

— Чалавек, які трапляе ў беларускую турму, на захаванне свайго здароўя не можа разлічваць. Я хачу пэўным чынам абвергнуць думку, што ў Беларусі парушаюцца правы чалавека. Дакладней сказаць — у чалавека ў Беларусі ніякіх правоў проста не існуе, тым больш у турме. Аналізуючы паведамленне як у незалежных, так і ў афіцыйных СМІ, я пераканаўся ў тым, што ў Беларусі ні ў каго акрамя партыі ўлады, ніякіх правоў няма.

— Дзе ўмовы былі лягчэйшымі — у мінскай турме ці ў магілёўскай калоніі?

— Калі разглядаць чалавека як жывёлу, то, безумоўна, лягчэй было ў зоне. Там і кормяць лепей, і свежае паветра, і шмат іншых выгадаў — толькі паводзь сябе так, як патрабуюць наглядчыкі. Але чалавеку, які жыве не толькі жывёльнымі інстынктамі, лягчэй у турэмнай камеры. У турме людзі розных поглядаў аб'ядноўваюцца ў барацьбе за сваё існаванне, а ў лагеры 95 працэнтаў «зэкаў»; навыперадкі бегалі да адміністрацыі, каб зрабіць данос на астатніх 5% і тым самым зарабіць сабе датэрміновае вызваленне.

— Як ставілася да цябе лагерная адміністрацыя?

— Я быў адзіным асуджаным ў калоніі, у каго на асабістай справе было пазначана: *«схільны да агітацыі і прапаганды, якая дэстабілізуе становішча ў папраўча-працоўнай установе»*. Таму я быў павінен рэгулярна з'яўляцца ў рэжымную частку, каб ахова бачыла, што я не рыхтую ні паўстання, ні ўцёкаў. «Оперы» праяўлялі да мяне вялікую ўвагу, практычна ўсе мае сшыткі і запісы канфіскоўваліся аховай.



Андрэй Шаптыцкі ў зале суда, верасень 1996 г. (Фота з архіва).

— Што за час, праведзены ў турме, табе было найбольш цяжка пераносіць?

— Асэнсаванне таго, што ўсе магчымасці для палітычнага супраціўлення рэжыму лідэры беларускай апазіцыі безнадзейна страцілі. Вызвольны рух, відаць, павінен змяніць лідэра, носьбіта ідэі. Сярод сённяшніх лідэраў апазіцыі я не бачу асоб, гатовых прынесці сябе ў ахвяру.

— Ты не шкадуеш, што прыехаў на той Чарнобыльскі шлях, які ператварыўся для цябе ў шлях па турмах?

— Няўжо ты не бачыш: толькі-толькі выйшаўшы на свабоду, я тут — на апазіцыйным мітынгу.

Гутарыў
Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Астравецкі праўдашукальнік

Гарадскі пасёлак Астравец, што на Гродзеншчыне, стварае прыемнае ўражанне. Тыповы правінцыйны гарадок, пры гэтым чысты і дагледжаны — чаго часам не скажаш пра іншыя райцэнтры. Жыццё ў Астраўцы, у параўнанні з буйнымі гарадамі, цячэ павольна і ціха.

Заняпад грамадскай актыўнасці — гэта, па цяперашняй беларускай сітуацыі, праблема нават у сталіцы. Што ўжо казаць пра глыбінку, дзе людзі натуральна засяроджаныя на ўласных побытавых пытання (чым, дарэчы, ахвотна карыстаюцца ўлады). Мясцовыя актывісты, жменька якіх ёсць у кожным рэгіёне, надворье не робяць. Дый актыўнасць іх таксама мае межы, часам даволі жорсткія.

Але ў Астраўцы ёсць такі чалавекам — Іван Фёдаравіч Крук. Ён, так бы мовіць, праўдашукальнік па прызванні. Прызванне зрэалізавалася ў і прафесійнай дзейнасці: І.Крук — маёр міліцыі ў адстаўцы. У крымінальны вышук ён пайшоў з-за таго ж абвостранага пачуцця справядлівасці (згадзіцеся: не самы распаўсюджаны матыў). Таму, хоць з прафесійнага пункту гледжання да Крука прэтэнзіяў ніколі не было, у адносінах з начальствам узнікалі складанасці.

Тры з паловаю гады таму пяцідзесяцігадовы Крук выйшаў на пенсію — і, натуральна, заняўся грамадскай дзейнасцю. Ён узначальвае Астравецкую раённую арганізацыю Аб'яднанай грамадзянскай партыі, мясцовае аддзяленне Усебеларускага клуба выбаршчыкаў і з'яўляецца дэпутатам райсавета. Дэпутацтва такога ўзроўню, асабліва ў глыбінцы, — гэта зусім не «высокая палітыка». Іван Крук займаецца пытаннямі матэрыяльнай дапамогі і жыллёва-камунальнага абслугоўвання; камусьці трэба будаваць хату, а кагосьці высяляюць з кватэры; таму не газафікуюць дом, а таму не падвезлі дровы. Прычым што паказальна — звяртаюцца да І.Крука не толькі выбаршчыкі ягонай акругі, але жыхары ўсяго раёна. І.Крук нікому не адмаўляе: заўжды разбіраецца са справаю, ездзіць па вёсках, сустракаецца з мясцовым начальствам. Дапамагае людзям, скарыстоўваючы сваю юрыдычную адукацыю, напісаць адпаведную паперу, і піша сам, ад уласнага імя, як дэпутат. Вядома ж актыўна выступае на кожнай сесіі райсавета. І, гэта часта дае плён: нават у нашых умовах, калі паслядоўна і настойліва прыкладаць энергію, — частка праблем абавязкова вырашаецца.

Іван Крук — мясцовы дэпутат і абаронца людзей.

Цяжэй, калі справа тычыцца злоўжыванняў мясцовага начальства. Але людзі звяртаюцца да І.Крука і з гэтай прычыны — і ён змагаецца. Людзі пільныя, згодныя заўважаюць, што мясцовы начальнік будуе раскошны гмах невядома на якія сродкі. Або ў калгасе, дзе месяцамі не выплочваецца зарплата і няма сродкаў, каб паставіць помпу на ваданапорную вежу (у выніку чаго вяскоўцы засталіся без вады) — старшыня знаходзіць грошы для набыцця службовага аўтамабіля. Да таго ж у тым калгасе ўвялі паборы з сялян: каб пасвіць карову на лузе, яны павінны былі аддаваць пэўную колькасць малака. І.Крук рашуча ўмяшаўся ў гэтае прыгоннае права.

У Астравецкай раённай бальніцы ў чэрвені адбыўся абласны семінар па ахове здароўя з удзелам намесніка міністра і перад візітам сталічнага госця зрабілі дарагі рамонт. Само па сабе гэта было б выдатна, бо ў выніку бальніца шыкоўна выглядае што звонку, што ў сярэдзіне, — каб толькі не тая акалічнасць, што ў бальніцы катастрафічна не стае лекаў. Так што той рамонт — ганебная блюзнерскай паказуха.

Даводзілася крыху гаварыць з жанчынай, мужу якой адзін з хірургаў бальніцы адмовіўся рабіць аперацыю. Па словах гэтай жанчыны, існуе канкрэтная стаўка хабару за аперацыю — 50 долараў (якія яна, дарэчы, заплаціла б). Пра гэта ёй пасля расказалі дасведчаныя людзі, але маецца на ўвазе, пасля смерці мужа.

Разбіральніцтвы, якія І.Крук ініцыюе ў мясцовай міліцыі і пракуратуры, нячаста прыносяць плён. Часам нейкія вынікі з'яўляюцца пасля зваротаў у цэнтральныя органы, у сталіцу. Акрамя таго, І.Крук выкарыстоўвае розныя спосабы для прыцягнення ўвагі грамадскасці. Напрыклад, праз асабістыя размовы (а па такіх гарадках, як Астравец, навіны разыходзяцца хутка без ніякіх сродкаў сувязі). Праз ладжанне пікетаў (ізноў жа не з палітычнымі, а з сацыяльна-побытавымі мэтамі). І, нарэшце, праз мясцовую прэсу. Праўда, дзеля апошняга аднойчы выпала звярнуцца ў суд.

Апублікаваць артыкул у «Астравецкай праўдзе» — натуральнае права дэпутата, бо райсавет — адзін з заснавальнікаў газеты. Але ж мы жывём не ў прававой дзяржаве, і газета адмовіла Круку. Суддзя Туманаў прапанаваў бакам заключыць міравое пагадненне, што і было зроблена. У выніку гэтага пагаднення паміж дэпутатам І.Круком і галоўнай рэдактаркай Н.Рыбік «Астравецкая праўда» надрукавала артыкул Крука «Мая пазіцыя застаецца нязменнай — барацьба з карупцыяй, беззаконнем і чынавенскім свавольствам», дадаўшы да яго рэдакцыйны каментарый. Што ж, калі ёсць жаданне знайсці агульную мову — яна абавязкова знойдзецца.

У бліскучым фільме «Той самы Мюнхгаўзен» адзін з персанажаў, бургамістр, ацэньвае свае штодзённыя службовыя абавязкі наступным чынам: «Не буду гаварыць, што гэта подзвіг — але нешта гераічнае ў гэтым ёсць». Думаю, не будзе перабольшаннем прыкладна гэтак сказаць і пра героя нашага нарысу. Не ўсіх задавальняе сённяшняе становішча але далёка не ўсе з гэтых незадаволеных робяць хоць што небудзь, каб змяніць сітуацыю да лепшага, хоць крышачку. А калі дзеля гэтай мэты чалавек прыкладае намаганні ўпарта і мэтанакіравана — гэта, безумоўна, заслугоўвае павагі. І такую павагу Іван Крук мае — прычым не толькі сярод тых людзей, правы якіх ён здолеў абараніць, ці тых, што спадзяюцца на ягоную неабыякавасць да іхніх праблемаў. Жыхары Астраўца з пашанай падыходзяць да Крука, на вуліцах ставяцца да яго з вялікай сімпатыяй. А з прыватных размоваў высветлілася, што належнае Круку аддаюць і тыя, хто ягоную актыўнасць ацэньвае скептычна, як нейкае «донкіхоцтва».

І тут не хочацца казаць банальных рэчаў накшталт таго, што непераадольных перашкодаў няма, што ў любой сітуацыі магчыма дасягнуць поспеху і да т.п. Папершае, «донкіхоцтва» — не самая кепская якасць. А па-другое, калі б такіх «дон-кіхотаў» было на Беларусі больш — краіна змянілася б. У лепшы бок, вядома.

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

СТАТИСТИКА

Экономика белорусской семьи в цифрах, коровах и кроликах

Министерство статистики и анализа ежегодно проводит выборочное обследование домашних (семейных) хозяйств Беларуси. Применяемая при этом методика корректна и позволяет считать получаемые данные достоверными для всех семей страны.

Шестьсот тысяч «бездомных»

Так вот, всего в Беларуси проживает 3.605,4 тыс. семей: 62,3% — в городах, 37,7% — в сельской местности. В Минске живет 15,2% всех семей, в больших городах (сыше 100 тыс. чел.) — 25,9% и 21,2% — в городках и традиционных белорусских местечках. В среднем на семью «приходится» 2,8 человека, половина семей имеет детей до 18 лет, 32% живут без детей (бездетные и семьи, в которых дети уже выросли до «семейнозрелого» возраста), 18% составляют «моносемьи» одиноких взрослых людей.

Среди «детных» семей 52,4% имеют одного ребенка, 40% — двоих детей, 5,8% — троих, 1,8% — четверых и более. В 12% семей дети живут только с одним из родителей (или опекунов).

Отдельную квартиру имеют 55,7% семей, 37,4% проживают в отдельных домах, 3,2% проживают в отдельных домах вместе с другими семьями, 3,4% обитают в общежитиях, а 0,3% маются в коммуналках. Среди горожан в общежитиях и коммунальных квартирах проживает каждая двадцатая семья. Причем число это существенно различается в региональном отношении. В Брестской области, например, в общежитиях проживает 1,7% семей, а в Минской — 6%.

Жилье 60% всех семей имеет 1-2 комнаты, 30% живут в трехкомнатных квартирах, и каждая 10-я семья располагает четырьмя и более комнатами. Меньше всего таких семей в Минске — 4%, больше в малых городах и сельской местности — 13,8 и 12,5% соответственно. Разница эта объясняется тем, что здесь больше частных домов.

Большинство (62,8%) всех семей имеют свое жилье в собственности, остальные арендуют, большинство — у государства, а 2,5% семей — у частных лиц. Из числа арендаторов 51,8% желают приватизировать свои квартиры. Этим гражданам хочется пожелать сделать это побыстрее, поскольку государство, о чем много сейчас говорят, собирается перейти от по сути бесплатной приватизации жилья, практикуемой сегодня, к фактической продаже квартиросъемщикам.

Нетрудно подсчитать, что с учетом семей, проживающих в общежитиях, коммунальных квартирах и арендующих жилье в частном секторе, жилищная проблема является первостепенной по меньшей мере для 223,5 тыс. семей или 626 тыс. человек.

Натуральное семейное хозяйство

Половина городских семей имеет земельные участки, а среди деревенских их не имеют 2%. Средний размер «городского» участка — 9, 5 соток, сельского — 50,86. Для ведения личного подсобного хозяйства горожане используют 1/3 участков, остальные — для садоводства, огородничества, дачного строительства и других приятных целей. Каждые 9 из 10 земельных участков используются для производства продукции внутрисемейного потребления, и лишь незначительная часть (в деревне 6,3%, в городе в три раза меньше) — «для семьи и на продажу». Таким образом, чисто товарных семейных хозяйств в Беларуси практически нет.

Основное назначение семейного земледелия состоит в том, чтобы компенсировать потери доходов от занятости членов семей в «большой» экономике. Она у нас организована так, что даже средний работник не может обеспечить свои потребности за счет зарплаты, пенсии и других выплат, обусловленных его работой по найму. Проще говоря, человек не может заработать себе «на огурцы» — и поэтому вынужден выращивать их вполне кустарным способом в свободное от основной работы или службы время.

Те горожане, кому условия не позволяют завести буренку, выстраиваются в очередь за свежим молоком из цистерны — и вкуснее, и дешевле, чем в магазине.

Еще недавно такая ситуация была характерна почти исключительно для жителей села и небольших городских поселений, теперь же затронула большие города. Таким образом, помимо традиционной деревенской бедности, для Беларуси стала характерной и новая городская бедность.

С точки зрения занятости она выражается следующими цифрами: на собственных «сотках» трудится 2,5 млн. семей, в которых проживает почти 7 млн. человек., что примерно в 2 раза превышает численность сельского населения, и в 7 раз больше численности работников, официально занятых в «большом» агросекторе.

Существует множество объяснений аграрного «хобби» белорусов. В том числе и лирического свойства, когда вся эта патриархальщина окрашивается в мягкие тона тоски по малой родине. Официальная пропаганда, напротив, считает ЛПХ частью единого агрокомплекса, который обеспечивает благосостояние населения. На наш взгляд, все гораздо проще. Большая агроэкономика производить дешевое продовольствие в нужных количествах не может, и население вынуждено компенсировать недостающее — за счет самоэксплуатации и самым примитивным образом. Если это и хобби, то вынужденное.

Порой оно приобретает и вовсе гротесковые формы. Так, 12,9% городских семей держат скот, а на «скотном дворе» Минска содержится 550 коров, 1.640 свиней, 24,7 тыс. кроликов и 64 тыс. птицы. Тот факт, что на различного рода официальных праздненствах на улицах столицы не представлены эти животные, можно объяснить или явным недоразумением, или же сознательной дискриминацией: если уж по честности, то абсурдности нашей экономики должна соответствовать и демонстрация ее достижений.

В больших городах, помимо Минска, население держит около 1 тыс. коров, почти 25 тыс. свиней и более 400 тыс. птицы. В малых городах — почти сельская идиллия: 20 тыс. коров, 256 тыс. свиней, 117 тыс. кроликов, 1,5 млн. птицы и 770 лошадей. В сельских хозяйствах содержится более 880 тыс. крупного рогатого скота, почти 2 млн. свиней, около 11 млн. птицы, 300 тыс. кроликов и 63 тыс. лошадей. Таким образом, при необходимости на коня можно посадить целую крестьянскую армию.

Но лошади это не кавалерийские, а рабочие. И останутся таковыми, пока вся отрицательная энергия населения будет направляться против колорадского жука, а не против неумных политиков.

Доставай стиральную доску

Между тем усилия народа выбиться из нищеты исключительно за счет самоэксплуатации непрерывно иссякают. Об этом тоже говорит статитстика. В 1990 году, например, среднедушевое потребление мяса составляло 75, в 1994 — 61, а в прошлом — всего 48 кг.

Причем из этих килограммов 1/3 часть производится самим населением. А все эти фермы, комплексы и тому подобные агроподразделения, лелеемые государством, производят чуть более 30 кг на каждого едока. Население почти полностью за счет собственного производства удовлетворяет свои потребности в картофеле, овощах и бахчевых культурах, наполовину — во фруктах и ягодах, более чем на 1/3 в молоке и яйцах и (даже!) производит 11% потребляемой рыбы и почти 10% сахара. Единственное, чего еще не освоило население, — так это выпечка хлеба.

Что же касается непродовольственных товаров, то возможности населения в его производстве, конечно же ограничены. Но и денег у него нет. Поэтому практически вся — более 90% — бытовая техника (телевизоры, холодильники, стиральные машины и прочее), которой пользуются белорусские семьи, приобретена до 1991 года. На новую денег нет, и, судя по всему, не предвидится.

Константин СКУРАТОВИЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Не забудзься заплаціць за сваё аўто

Да 1 жніўня беларускія аўтаўладальнікі павінны папоўніць дзяржаўную кішэню, заплаціўшы спецыяльны штогадовы збор за карыстанне аўтасродкамі.

Новы «Парадак спагнання збору з уладальнікаў аўтатранспартных сродкаў» пачаў дзейнічаць месяц таму, і не ўсе пра яго чулі. А трэба паспяшацца, бо за кожны дзень пратэрміноўкі аплаты давядзецца плаціць пеню.

Квіток аб аплаце збору трэба захоўваць належным чынам — без яго нельга будзе прайсці тэхнічны агляд, рэгістрацыю і перарэгістрацыю аўтатранспартнага сродку.

Стаўкі збору складаюць:

— матацыкл — 0,5 МЗП;

— аўтамабілі з дазволенай максімальнай вагой не больш за 3.500 кг — 2,0 МЗП (для юрыдычных асоб — 4,0 МЗП);

— аўтамабілі, прызначаныя для перавозкі грузаў, дазволеная максімальная вага якіх больш за 3.500 кг — 4,0 МЗП;

— прычэпы да легкавых аўтамабіляў — 1,0 МЗП (для юрыдычных асоб — 2,0 МЗП);

— прычэпы і паўпрычэпы для грузавых аўтамабіляў — 4,0 МЗП;

— трактары — 2,5 МЗП.

Цікава, што за набытыя ў другім паўгоддзі аўтатранспартныя сродкі новым уладальнікам таксама трэба плаціць палову збору — нават калі яго цалкам аплацілі былыя гаспадары.

Ад аплаты збору вызваляюцца ветэраны вайны, мнагадзетныя сем'і, юрыдычныя асобы, якія фінансуюцца з рэспубліканскага ці мясцовых бюджэтаў, дыпламатычныя і консульскія ўстановы, а таксама аўтатранспартныя арганізацыі, якія выкарыстоўваюць аўтатранспартныя сродкі як таксі. Плаціць збор таксама не трэба за машыны і механізмы на гусенічнай хадзе — трактары, бульдозеры і танкі.

Наталля ЕРАХАВЕЦ

Дзяцей-інвалідаў навучаць плесці з лазы

У Магілёве адчыніўся цэнтр сацыяльнай і прафесійнай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў.

Ён дзейнічае на базе ПТВ № 70. У цэнтры будуць праходзіць сацыяльную і прафесіянальную рэабілітацыю больш за 100 чалавек, якія маюць парушэнні зроку і слыху, артапедычныя захворванні, недахопы ў разумовым развіцці. Дзеці змогуць атрымаць спецыяльнасці, што дапамогуць ім выжыць у дарослым свеце — разьбяра па дрэве, сталяра, швачкі, абутніка, навучацца працаваць з саломкай і лазой. З выхаванцамі цэнтра будуць займацца не толькі педагогі, але і медыкі. Як лічыць дырэктар ПТВ № 70 Алег Бахановіч, у наступным годзе цэнтр зможа павялічыць колькасць месцаў для дзяцей-інвалідаў у 2 разы.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Была лазня, стала пякарня

Памяшканне былога банна-пральнага камбіната вёскі Козенкі, што пад Мазыром, выкарыстаў пад пякарню калгас «Радзіма».

Магутнасць сельскай пякарні — 2.000 боханаў хлеба ў суткі. Гэтага дастаткова, каб забяспечыць свежым хлебам і жыхароў вялікай вёскі Козенкі, і суседніх вёсак. Ім даспадобы і хлеб, і заўсёды свежыя булкі з мясцовай пякарні.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Невядомая магіла

На мінулым тыдні будаўнічыя работы ў Гомельскім парку культуры і адпачынку імя Луначарскага былі прыпыненыя: каля рэстарана «Беларусь» будаўнікі наткнуліся на чалавечыя парэшткі.

Адкапаная таксама сатлелы абутак, скураны рамень, бутэлька з нейкай вадкасцю. На думку супрацоўнікаў абласнога краязнаўчага музея, знаходкі аднosяцца да 1941 года. Магчыма, тут загінуў гомельскі апалчэнец, які не здолеў разам з Краснай арміяй адысці з горада.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Крамлёўскі вартавы

Больш дзесяці сутак, калі палічыць усе каравулы даўжынёй у гадзіну, прастаяў мінчанін Дзмітрый Вярбіцкі на пасту № 1 — каля ўваходу ў Маўзалей. Усяго Ленін ляжыць у сваім склепе ўжо амаль 27 тысяч дзён (з 25 студзеня 1924 г.), і час, калі цела правадыра працоўных ахоўваў наш зямляк, уяўляецца кропляй у моры. Аднак і праз гэтую кроплю, як праз лінзу, можна ўбачыць некаторыя асаблівасці эпохі, што ўжо адышла ў гісторыю.



Куранты на Спасскай вежы адлічвалі тую гадзіну, якую вартавыя навыцяжку стаялі на пасту № 1 — да наступнай змены.

Славянскі твар у крамлёўскім буфеце

Адбор салдат у Крамлёўскі полк, а тым больш у РСК (рота спецыяльнага каравула), якая несла дзяжурства на пасту № 1, быў сістэмай, што адлюстроўвала тыповыя рысы савецкага ладу жыцця: закрытасць, любоў да паказушнасці, высокая ідэйнасць у спалучэнні з кар'ерыстычнымі памкненнямі, якія тады лічыліся праявай «буржуазнага жыцця». Канкрэтны прыклад: Дзмітрыя прызвалі ў Крамлёўскі полк, выбраўшы з некалькіх дзесяткаў кандыдатаў з Беларусі. Ён падыходзіў па росце (не менш як 178 см), па «славянскім абліччы» (азіятаў ці нават каўказцаў на пост № 1 не дапускалі), па паводзінах (ніводнага прыводу ў міліцыю, выдатная камсамольская характарыстыка), па складзе сям'і (сярод сваякоў ворагаў народа не было). Існавала нават і такое патрабаванне, як адсутнасць на целе любых татуіровак.

Але ж такіх, як ён, сярод прызыўнікоў 1983 года можна было знайсці тысячы! Справу вырашыў лёс. На прызыўным пункце Вярбіцкі нечакана для сябе даведаўся, што яму трэба прайсці дадатковы медыцынскі агляд і субяседванне з людзьмі ў цывільным. Гэтыя людзі і паведамілі яму, што ён трапіў у «каманду 200». Але што гэта такое стала вядома толькі ў Маскве. Вось дзе Дзмітрый зразумеў, што яму свеціць служба ў Крамлёўскім палку, а гэта можа мець велізарнае значэнне для наступнай кар'еры: дзверы любой маскоўскай ВНУ лёгка адчыняліся перад тым, хто меў ганаровую грамату ЦК камсамола, а «пакруціўшыся» зарабіць такую грамату шанец быў!

Іншая рэч, што далёка не ўсе «крамлёўцы» ставілі на мэце застацца ў Маскве. Некаторыя разглядалі службу, якая давала магчымасць пастаяць на пасту № 1 збольшага як экзотыку і магчымасць не трапіць у звычайнае войска. Але такіх «рамантыкаў» было ўсё ж менш, чым «прадбачлівых». Па назіраннях Дзмітрыя, 80% усіх прапаршчыкаў палка раней служылі ў ім звычайнымі салдатамі. Падпісаўшы кантракт, яны адразу атрымлівалі інтэрнат, а праз 2—3 гады і кватэру ў Маскве. У крамлёўскіх крамах, буфетах і сталоўках служывыя лёгка маглі купляць рэчы і прадукты, якія за Крамлёўскай сцяной цяжка было дастаць нават па вялікім блаце. Чаму ж не пастарацца, каб застацца ў гэтым аазісе назаўсёды?

Маскоўскі загар і тлустыя вушы

Сакрэтнасць і арэол выключнасці, які суправаджаў вартавых ля Маўзалея, садзейнічалі ўзнікненню самых неверагодных чутак аб умовах іхняй працы і жыцця ўвогуле. Цікава, што толькі стоячы на пасту № 1 пры ўваходзе (унутры Маўзалея існуе яшчэ некалькі пастоў) і можна было «ўжывую» пачуць гэтыя чуткі, бо людзі расказвалі іх адзін аднаму, зусім не звяртаючы ўвагі на пастаўых. Чаго толькі не даведаўся Дзмітрый пра свой пост! Што хлопцаў гэтых муштруюць па некалькі гадоў, што аднаго з іх расстралялі толькі за тое, што на пасту не ўтрымаў у руках карабін, што на спецыяльным самалёце яны штомесяц лётаюць на адпачынак у Крым (таму такія загарэлыя), што зарабляюць у залежнасці ад «прастою».

Самым цяжкім для вартавых у той момант было стрымаць усмешку. Бо пры ўсёй элітнасці іхняй службы, яна не была пазбаўленая звычайных для войска рэчаў: іх, як усіх савецкіх салдат, начальства гэтак жа выкарыстоўвала на ўсялякіх гаспадарчых работах: у складах, пры рамонце. Выключэннем быў толькі свінарнік, дзе працавалі салдаты гаспадарчай роты (дарэчы, па словах Дзмітрыя, такіх тоўстых парсюкоў, як крамлёўскія, — падсобная гаспадарка ў 30 км ад Масквы, — ён ніколі нідзе не бачыў). Што тычыцца муштроўкі, то і тут рэчаіснасць не супадала з плёткамі: муштравалі іх, канечне, не параўнаць са «стройбатам», але зусім не цэлы год. Найчасцей заступалі на пост № 1 праз 4 месяцы пасля з'яўлення ў палку, а аднойчы, калі адразу некалькі «дзядоў» захварэлі на жаўтуху, да Маўзалея паставілі маладых.

Гэты выпадак — добрая ілюстрацыя і да чутак аб самалёце ў Крым. Загаралі хлопцы выключна пад сціплым маскоўскім сонцам, і яго не надта хапала, бо над галовамі вартавых Маўзалея навісала вялізная гранітная пліта. І ўсё ж летам было горш як зімой — у летнюю спёку кашуля была мокрай ад поту — хоць выкручвай. Дадавалі праблемаў і скураныя боты — прэлі ногі, нылі суставы. А вось зімой салдаты турбаваліся аб адным — каб тэмпература не панізілася раптоўна падчас стаяння, калі ты ўжо не маеш магчымасці змяніць форму. Але нават у такім экстраным выпадку прыходзіла «хуткая дапамога» — быў спецыяльны чалавек, які мазаў тлушчам насы і вушы вартавых ды падымаў каўняры шынялёў, а ад астатняга бараніла цыгейка ды тоўстая бялізна з чыстай бавоўны.

Стук-стук – і штыком

Гэта толькі звонку магло падацца, што вартавы ля Маўзалея адрэзаны ад усяго свету і не мае з ім ніякіх кантактаў. Сродак сувязі існаваў, прычым вельмі эфектыўны, і зусім не з галіны звышадчувальнай электронікі. Гэтым сродкам быў карабін, якім узбройвалі вартавых, дакладней, не сам карабін, а шомпал. Непрыкметна пастукваючы пальцам па шомпале, вартавы даваў сігнал тым, хто нёс каравул у сярэдзіне Маўзалея. У абавязак паста № 1 уваходзіла папярэджваць такім чынам пра ўсіх падазроных ля ўваходу ў Маўзалей: напрыклад, калі хто спрабаваў пералезці праз вяровачную агароджу. А калі б нехта напаў на каравульных — па інструкцыі яго дазвалялася закалоць штыком.

Патронаў у сярэдзіне 80-х ужо не выдавалі. Як зразумеў Дзмітрый, не з-за таго, што баяліся стралянiны на галоўнай плошчы краіны. Проста занадта частымі сталі выпадкі, калі падчас змены каравула вартавыя настолькі моцна бразгалі прыкладамі сваіх карабінаў па гранітнай падлозе, што адляталі абоймы з патронамі. Гэта рабілася быццам бы незнарок, а на самой справе з'яўлялася нечым накшталт прафесійнага «форсу», супраць якога кіраўніцтва нічога не здолела прыдумаць, як толькі зусім адмовіцца ад выдачы патронаў.

Пры гэтым начальства нічым не рызыкавала. Да сярэдзіны 80-х кантроль за падзеямі на Краснай плошчы быў наладжаны такі, што па сутнасці пост № 1 стаў проста дэкарацыяй. Адразу некалькі відэакамераў з усіх бакоў «прастрэльвалі» усю плошчу і падыходы да Маўзалея. Усе сігналы выводзіліся на маніторы ў спецыяльным пакоі, дзе неслі дзяжурства самыя давераныя і вопытныя. Акрамя міліцыянтаў і салдат Крамлёўскага палка, сітуацыю на плошчы кантралявалі спецыяльныя групы гэбістаў, якія заўсёды мелі пад рукой аўтамабіль.

Паколькі з пачатку 80-х рэзка ўзрасла колькасць самаспаленняў, была распрацаваная цэлая сістэма, каб перашкодзіць тым, хто вырашыў звесці рахункі з жыццём менавіта на Краснай плошчы. Патэнцыйных «самаспальшчыкаў» адсочвалі яшчэ на падыходах, а калі гэтае сіта не спрацоўвала, выкарыстоўваўся запасны варыянт. На газонах ляжалі напагатове спецыяльныя коўдры і вогнетушыльнікі, з дапамогай якіх за імгненні гасіўся любы «жывы факел». Але часцей за ўсё справа да агню не даходзіла. Чалавек, абліўшы сябе бензінам, не паспяваў яшчэ і чыркнуць запалкай, як яго перахоплівалі, запіхвалі ў дзяжурную «Волгу» і адвозілі на разборкі да спецыялістаў з Лубянкі ці адразу ў вар'яцкі дом. Дзмітрый Вярбіцкі сцвярджае, што такое здаралася прыкладна раз у два-тры месяцы. Калі прадухіліць выпадак самаспалення дапамагаў служывы Крамлёўскага палка, яму за гэта «свяціла» як меншае ганаровая грамата ЦК камсамола. Добры пачатак для кар'еры!

За гадзіну да цягніка

Як паўсюль, у Крамлёўскім палку існавала сістэма пакаранняў. Дзмітрый не ўзгадвае, каб некага адпраўлялі на гаўптвахту: кантынгент усё ж быў падабраны някепска. За крамлёўскімі мурамі існавала свая сістэма каштоўнасцяў, таму і пакаранні былі своеасаблівыя. Напрыклад, «дэмбеля» маглі выпусціць з Крамля за гадзіну да цягніка, які павязе яго дадому. Гэтае пакаранне лічылася самым-самым. Рэч у тым, што кожны «крамлёвец» звычайна яшчэ за год да «дэмбеля» дакладна ведаў не толькі дзень, але і гадзіну свайго звальнення.

Верхам поспеху лічылася атрымаць усе паперы раніцай, каб мець да вечара час пагуляць па Маскве, пакрасавацца сваёй асаблівай выпраўкай і бравым выглядам. Калі ж цябе адпусцяць толькі ўвечары — гэта сорам! Яшчэ ўсе баяліся, што пры выпуску не дадуць значок «Крамлёўскі полк». Кожны з «дэмбеляў» добра разумеў, што ў звычайным асяроддзі ніхто на гэты маленькі значок не зверне ўвагі, але быць пазбаўленым яго лічылася сярод сваіх велізарнай ганьбай.

За што ж маглі выпасці на галовы крамлёўскіх стражнікаў гэтакія кары? Звычайна — за парушэнне службовых інструкцыяў, якіх для кожнага паста было напісана безліч. Напрыклад, час ад часу было, што да таго ці іншага аб'екта ў Крамлі падыходзілі людзі, якія не мелі права на ўваход менавіта праз гэты пост. Пры вельмі заблытанай сістэме пропускаў, якая да таго ж ускладнялася пасля з'яўлення ў Крамлі кожнага новага гаспадара, памыліцца было няцяжка, што і здаралася. Дзмітрый, дарэчы, перажыў дзве такія рэформы і сцвярджае, што ў выніку Крэмль не стаў ахоўвацца лепш.

Хэлоў, Маргарэт!

Большасць з крамлёўскіх вартавых можа пахваліцца, што сустракаўся з першымі асобамі краіны «твар у твар», але, бадай, толькі вартавыя пачатку і сярэдзіны 80-х дададуць да пачэснай калекцыі сваіх «візаві» першых асобаў свету. Дзмітрый Вярбіцкі якраз з такіх шчасліўцаў. Ён бачыў «вось як цябе» Маргарэт Тэтчар, Гельмута Коля, Бабрака Кармаля (тагачасны лідэр Аўганістана) ды іншых «магутных свету». Нагода, праўда, была не вельмі вясёлая — пахаванне чарговага генеральнага сакратара.

Але падобныя падзеі засталіся ў памяці не дзякуючы сустрэчам, а зусім з-за іншых, балючых перажыванняў. Так, падчас аднаго з пампезных пахаванняў пацярпелі ад марозу амаль усе вартавыя, якіх паставілі ля Маўзалея ў так званае «знешняе ачапленне». Загад апрануцца ў адпаведнасці з надвор'ем прыйшоў запозна, і каля дваццаці салдат адмарозілі вушы. Дарэчы, ім потым, пры звальненні, без праблемаў уручылі значкі «Крамлёўскі полк». Во радасці было!

Было. Будзе?

...У 1993 годзе па загадзе прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына дзяжурства на ганаровым пасту ля маўзалея Леніна было адмененае. Што ж тычыцца ўнутраных пастоў, то, па звестках, усе яны існуюць, працуюць у былым рэжыме ў той час, калі Маўзалей адчынены, што здараецца ўсё радзей. Не выключана, што Ельцын давядзе чарговы этап дэкамунізацыі, якую ён распачаў у 1991 годзе, да канца, і мумія Леніна нарэшце знойдзе прытулак у зямлі на звычайных могілках.

Як меншае, гэта будзе азначаць, што прафесія, якой авалодаў у Маскве мінчук Дзмітрый Вярбіцкі, канчаткова страціць актуальнасць у Расіі. Іншая рэч, ці не з'явіцца свой пост № 1 у нас, у Мінску? Сёння задаваць такія пытанні ўжо ёсць падставы.

Са словаў вартавога савецкага паста № 1 запісаў

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 34.200
Нумар падпісаны ў друк 29.07.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 334